жр 3249
Библиотека
АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Прачытаў — перадай другому

# СЦЯГ ЛЕНІНА

Орган Бярэзінскага падпольнага РК КП(б)Б
№ 15 | Субота 11 верасня | 1943 г.

НАСТУПАЮЧЫ НА СМАЛЕНШЧЫНЕ, ОРЛОЎШЧЫНЕ І ЧАРНІГАЎШЧЫНЕ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ПРЫБЛІЖАЕЦЦА ДА РОДНАЙ БЕЛАРУСІ.
ПАРТЫЗАНЫ І ПАРТЫЗАНКІ! УПЕРАД, НА АПОШНІ РАШАЮЧЫ БОЙ! МАЦНЕЙ УДАРЫ ПА АДСТУПАЮЧЫМ НЕМЦАМ!

## Данбас вызвален

Войскі Паўднёвага і Паўднёва Заходняга франтоў у рэзультаце ўмелага манеўра і страмiцельнага наступлення, адзяржалі грандыёзную перамогу ў Данецкім Басейне над нямецкімі захватчыкамі. Зламаўшы супраціўленне ворага, нашы войскі на працягу шасці дзён з баямі аўладзелі гарадамі Дэбальцава, Іловайск, Лісічанск, Енокіево, Горлаўка, Чысцякова, Словянск, Арцёмаўск, Краматорская, Канстанцінаўка, Макееўка, Краснаармейскае, Ясінаватая і абласным цэнтрам Данбаса—горадам СТАЛІНА.

Такім чынам Чырвоная Армія адбіла ў немцаў і вярнула нашай Радзіме ДАНЕЦКІ БАСЕЙН—важнейшы вугальны і прамысловы цэнтр краіны.




Вон з Данбаса!

## Страты нямецка-фашысцкіх войск на савецка-германскім фронце за час з 5 ліпеня па 5 верасня

За два месяцы летніх баёў нашы войскі на ўсіх франтах знішчылі: самалётаў праціўніка 5.129, танкаў—8.400, пушак—5.192, аўтамашын—больш 28.000.

Страты праціўніка забітымі састаўляюць больш 420.000 салдат і афіцэраў. Усяго ў баях, з 5 ліпеня па 5 верасня, выведзена з строя, забітымі і раненымі, не менш 1.500.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

За гэты-ж час нашы войскі захапілі: танкаў—1.041, пушак розных калібраў, у тым ліку самаходных—2.018, кулямётаў—5.322, аўтамашын—7.853.

Узята ў палон 32.600 нямецкіх салдат і афіцэраў.

СОВІНФОРМБЮРО

## Перамога партызан

Ноччу з 10 на 11 верасня партызаны маланкавым ударам адначасова разграмілі некалькі варожых гарнізонаў, якія былі размешчаны ў Бялыніцкім раёне. Разгромлен варожы гарнізон у Бялынічах. Многа немцаў, паліцэйскіх і здраднікаў забіта, больш 40 узята ў палон. Партызаны захапілі склад боепрыпасаў, дакументы раённай управы і орцкамендатуры, спалены склады заготзярно і заготсена, знішчаны масты на рацэ Друць. Вызвалена многа сялян, якіх фашысцкія каты трымалі ў турме.

Таксама разгромлены варожыя гарнізоны ў Машчаніцы і інш.

## Заняты Марыупаль

### (З ПАВЕДАМЛЕННЯЎ СОВІНФОРМБЮРО АД 9 І 10 ВЕРАСНЯ)

9 верасня пасля двухдзённых баёў нашы войскі аўладзелі горадам БАХМАЧ—важнейшым чыгуначным вузлом, цэнтрам комунікацый ворага і рашаючым пунктам абароны немцаў на Кіеўскім напраўленні.

У рэзультаце смелага манеўра нашых конных і механізіраваных часцей 10 верасня вызвален ад нямецкіх акупантаў горад і порт МАРЫУПАЛЬ—важнейшы металургічны цэнтр краіны.

На працягу 10 верасня нашы войскі на Паўлаградскім напрамку прадаўжалі паспяховае наступленне і прадвінуліся ўперад ад 20 да 40 кілометраў і занялі звыш 140 насялёных пунктаў, у тым ліку гарады: Барвенкова, Чапліно, раённы цэнтр Харкаўскай вобласці—Пятроўская і раённыя цэнтры Днепрапятроўскай вобласці—Петрапаўлаўская, Межавая.

На захад ад горада Сталіно нашы войскі прадвінуліся ўперад ад 10 да 20 кілометраў і занялі горад і важнейшы чыгуначны вузел у прыазоўі Волнаваха, горад Краснагорка і многа іншых насялёных пунктаў.

На поўнач ад Бранска нашы войскі прадвінуліся за дзень ад 6 да 10 кілометраў і занялі звыш 80 насялёных пунктаў. Паўднёвей Бранска нашы войскі фарсіравалі раку Дзясну і вядуць баі за горад Ноўгарад Северскі.

Наступленне паспяхова прадаўжаецца.

экр 3249

# Капітуляцыя Італіі

Лондан 8 верасня (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што штаб саюзных войск у Паўночнай Афрыцы паведамляе аб капітуляцыі Італіі.

У заяўленні маршала Бадальо гаворыцца, што італьянскі ўрад „прызнаў немагчымым прадаўжаць няроўную барацьбу супроць перавышаючай магутнасці ворага“.

Ваенныя дзеянні супроць войск саюзнікаў італьянскімі войскамі паўсямесна спыняюцца. Італьянскі ўрад Бадальо звярнуўся да саюзнікаў з просьбай, аказаць італьянцам дапамогу ў саўмесным выгнанні з тэрыторыі Італіі нямецкіх войск.

## Высадка войск саюзнікаў у Італіі

Адразу-ж пасля капітуляцыі Італіі пачалася масавая высадка войск саюзнікаў на італьянскую тэрыторыю. 9 верасня войскі саюзнікаў высадзіліся ў раёне Неапаля і паспяхова вядуць наступленне супроць нямецкіх войск. Высадка саюзных войск прадаўжаецца па ўсяму пабярэжжу Італіі.

* * *

Генерал Вільсон, ад імя галоўнага камандавання англійскіх ўзброеных сіл на бліжнім усходзе, прапанаваў італьянскім узброеным сілам на Балканах і на Додзеканозскіх астравах аказаць супраціўленне немцам і сілай ауладзець усімі пунктамі, якія акупіраваны немцамі.

Камандуючы ваенна-марскімі сіламі саюзнікаў у Сярэдземным моры адмірал Кеннінхэм зрабіў па радыё заяўленне ў якім паведаміў, што італьянскія караблі, якія знаходзяцца ў Сярэдземным моры, неадкладна павінны направіцца ў Гібралтар, Трыполі, на Мальту, у Хайфу і Александрыю. Італьянскія караблі, якія знаходзяцца ў Чорным моры, павінны направіцца ў рускія парты, а гандлёвыя судны, якія знаходзяцца ў Эгейскім і Чорным морах і падвяргаюцца пагрозам захвата іх немцамі, павінны быць патоплены або выведзены з строя.

## Нечаканасць для Гітлера

Гітлераўскае агенцтва—германскае інформбюро паведаміла аб капітуляцыі Італіі. Агенцтва заяўляе, што „капітуляцыя Італіі з'яўляецца здрадніцкім ударам па абаронцах Еўропы“ г. зн. ударам па Германіі і яе васалах.

## Прыём І. В. СТАЛІНЫМ мітрапаліта Сергія, мітрапаліта Алексея і мітрапаліта Нікалая

4 верасня ў старшыні СНК СССР тав. І. В. СТАЛІНА састаяўся прыём, у час якога мела места гутарка з патрыаршым местаблюсціцелем мітрапалітам Сергіям, Ленінградскім мітрапалітам Алексеям і экзархам Украіны Кіеўска-Галіцкім мітрапалітам Нікалаем.

У час гутаркі мітрапаліт Сергій давёў да ведама старшыню СНК СССР, што у кругах праваслаўнай царквы маецца намер у бліжайшы час сазваць сабор епіскапаў для выбару патрыарха Маскоўскага і Усея Русі і саздання пры патрыярху Свяшчэннага Сінода. Тав. СТАЛІН спачувальна аднёсся да гэтых пытанняў і заявіў, што з боку ўрада не будзе ніякіх перашкод. Пры гутарцы прысутнічаў намеснік старшыні СНК СССР тав. В. М. МОЛАТАЎ.

## Расстрэл за сяўбу жыта

Рыхтуючыся да бегства з Беларусі, немцы разрушаюць нашы гарады і вёскі. Гітлераўскія звяры выдалі загад, які забараняе сялянам сеяць азімае жыта. Так, у вёсцы Міхеевічы, Дмітраўскай воласці, фашысты расстралялі двух сялян за сяўбу азімага жыта.

Немцы хочуць задушыць беларускі народ галоднай смерцю. Адзінае наша спасенне ў бязлітаснай барацьбе з акупантамі.

## У АДКАЗ НА ЗВАРОТ ВОІНАЎ-БЕЛАРУСАЎ

## Дапамагаем наступаючай Чырвонай Арміі

Апошні час падрыўныя групы пад кіраўніцтвам Пятра Ш., Міхаіла К. Міхаіла Ш. дзейнічалі ў раёне чыгуначных дарог. Дыверсанты спусцілі пад адкос 4 варожых эшалоны. Разбіта 5 паравозаў і 26 вагонаў, з якіх 14 вагонаў з жывой сілай ворага.

На маей міне узарваўся вялікі варожы эшалон, які следаваў у напрамку фронта. Знішчаны паравоз, 4 вагоны з танкамі, 3—з аўтамашынамі і 2—з жывой сілай. Другая падрыўная група ўзарвала эшалон, следаваўшы з фронта. Разляцеліся ўшчэнт 8 вагонаў з немцамі.

У рэзультаце дзейнасці нашых падрыўнікоў загінула больш 1000 гітлераўцаў.

Нікалай П—кі.
Атрад тав. Б.

## З аўтаматаў і вінтовак

Партызаны з атрада, якім камандуе тав. Б., адпачывалі на беразе ракі Бярозы. Раптам загуў матор і з-за рачнога паварота выплыў нямецкі катэр. Партызаны ў момант занялі абарону і адкрылі агонь з аўтаматаў і вінтовак. Свінцовы лівень абрушыўся на нямецкія галовы. Праз дзесяць хвілін варожы катэр патануў. Забіта 8 немцаў.

## На дно рачное

Гітлераўскія рабаўнікі задумалі па рэчцы транспартыраваць награблены хлеб. Нямецкі катэр цягнуў баржу з зярном па Бярэзіне да Барысава. Партызанскі атрад тав. Д. арганізаваў засаду. Рабаўнікі былі сустрэты моцным ружэйна-кулямётным агнём. Катэр і баржа з хлебам патанулі. Забіта 17 немцаў. Партызаны захапілі некалькі вінтовак. Астатняе ўзбраенне, якое было на катэры, мінамёт, станкавыя кулямёты, патанулі.

Александр Ф.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

Друкарня газеты „За радзіму“.